УДК 930.1(476)"1921/39"

# КАНФЕСІЙНАЯ ГІСТОРЫЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1920–1930-Х ГАДОЎ: ПРЫЯРЫТЭТЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

**А. А. Савіч**
*дэкан гістарычнага факультэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*
*Беларусь, г. Брест, БрДУ імя А. С. Пушкіна*

*Анатацыя.* У артыкуле адлюстраваны канцэптуальныя падыходы да адлюстравання айчыннымі аўтарамі канфесійнай гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., прадстаўлены ідэйна-палітычныя прыярытэты беларускай савецкай гістарыяграфіі тэмы і і яе перспектывы.

*Ключавыя словы*: Заходняя Беларусь 1921–1939 гг., канфесійная гісторыя, айчынная гістарыяграфія, ідэйна-палітычныя прыярытэты, перспектывы даследавання.

Рэлігійнае пытанне і канфесійныя адносіны былі важнымі фактарамі грамадска-палітычнага жыцця міжваеннай Польшчы і Заходняй Беларусі. Ва ўмовах адроджанай у 1918 г. Польшчы рэзкае змяненне статуса праваслаўя і каталіцызму на тэрыторыі Заходняй Беларусі садзейнічала абвастрэнню этнаканфесійных адносін і ўздымала рэлігійную тэматыку на вышэйшыя паверхі абмеркавання розных урадавых, грамадска-культурных і палітычных структур. Правадыр Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, беларускі ксёндз-каталік А. Станкевіч падкрэсліваў палітычную ролю каталіцкай царквы, адзначаючы яшчэ ў 1921 г., што замест "касцёла каталіцкага ў Віленшчыне і Гродзеншчыне паўстаў і пануе аж да сёння касцёл польскі, установа чыста палітычная, або прадстаўніцтва польскага нацыяналізму ў Заходняй Беларусі" [1, s. 1]. Натуральна, акрэсленая праблематыка атрымала асвятленне на старонках як перыядычных выданняў, так і ў навуковых публікацыях.

Уздымаючы актуальнае пытанне этнаканфесійнай палітыкі Польшчы, айчынныя аўтары акцэнтавалі ўвагу на недабразычлівых праявах да праваслаўнай царквы і ўвогуле да беларускага народа, справядліва ў якасці канчатковыай мэты польскай улады называлі акаталічванне, асіміліцыю і паланізацыю краю [2; 3; 4]. З улікам прадэклараваных гарантый роўных правоў для ўсіх рэлігій паводле польскай канстытуцыі падкрэслівалася неаднолькавае стаўленне польскага ўраду да асобных канфесій. Акцэнтацыя на абмежаванні ў дачыненні да праваслаўя, закрыцці цэркваў, штучныя бар'еры пры адкрыцці і рэгістрацыі праваслаўных абшчын, канфіскацыю маёмасці праваслаўных прыходаў і іншыя мерапрыемствы рэвіндыкацыі, ўзмацняла негатыўнае стаўленне праваслаўнага насельніцтва да польскай улады і каталіцкай царквы як правадніка і выканаўцы асіміляцыйнай польскай палітыкі [3, с. 40; с. 8–10].

Каталіцкая царква як ідэйна-духоўная аснова польскай палітычнай улады айчыннымі аўтарамі справядліва атрымлівала ролю ініцыятара і выканаўцы польскай асіміляцыйна-паланізацыйнай палітыкі. Адзначаючы наяўнасць абмежаванняў у дачыненні да некаталіцкага насельніцтва, падкрэсліваўся і абсалютызаваўся дзяржаўна-палітычны прыярытэт, якім карысталася каталіцтва і каталікі: "…свабода веры ў Польшчы існуе толькі для каталікоў. …людзям

не-каталіцкай веры – будзь то земляроб, настаўнік, інжынэр, гандляр, – усё адно, – жыцьця ў панскай Польшчы няма” [3, с. 40].

У публікацыях БССР згадваліся “стараньні абярнуць у фактар спольшчваньня” нават праваслаўную царкву, якая ў асобах сваіх вышэйшых іерархаў “узамен на матар’яльны добрабыт ахвотна йдзе насустрач плянам польскага ўраду”. Да здраднікаў інтарэсам народаў былі аднесены вышэйшыя праваслаўныя іерархі, “пастаўленыя” на адпаведныя пасады польскімі чыноўнікамі, таму аўтарытэт “іх зусім слабы”, а праваслаўныя беларусы і ўкраінцы не хочуць прызнаваць іх за сваіх і “проста прагналі-б іх вон, як наймітаў польскага ўраду, каб маглі гэта зрабіць” [2, с. 41; 3, с. 16]. Як бачым, заўважаецца жаданне аўтараў на падставе прынцыпа “падзяляй і ўладаруй” вылучыць з агульнага праваслаўнага асяродка працiўнікаў і прыхільнікаў польска-каталіцкай улады.

На гэтым фоне заслугоўваюць увагі прыклады палітычна абумоўленых дзеянняў прадстаўнікоў праваслаўнай іерархіі і прыходскіх святароў. Так, фіксуючы негатыўнае стаўленне айчынных аўтараў да падпарадкавання і апалячвання праваслаўнай царквы праз аўтакефалію, фінансаванне яе польскім урадам, пераклад набажэнства на польскую мову, адзначым рэдкую для выданняў БССР інфармацыю аб жаданні беларускіх нацыянальна-буржуазных дзеячаў “захапіць праваслаўную царкву ў Польшчы ў свае рукі і зрабіць яе праваднікoм сваіх уплываў”. Аўтар не хавае свайго задавальнення ад таго, што такія “стараньні (прынамсі ў Зах. Бел.) ня маюць посьпеху. Праўда, у Вільні ёсьць невялікі гурток праваслаўнага духавенства, які сымпатызуе беларускаму нацыянальна-культурнаму руху, але не карыстаецца ўплывамі” [5, с. 21]. Цяжка сказаць, якая суполка мелася на ўвазе аўтарам, відавочна, яна не была пад уплывам падкантрольных БССР інстанцый – арганізатараў рэвалюцыйнага падполля ў Заходняй Беларусі. Тут, дарэчы, неабходна будзе згадаць і названае 5 красавіка 1924 г. у дакументах паліцыі “Праваслаўнае філантрапічнае таварыства” як канфідэнцыйную арганізацыю, што атрымлівала “фундуш ад саветаў праз невядомую асобу, якая пражывае ў Вільні, і ад Рускага папячыцельскага камітэта ў Варшаве”. Паводле дакумента, у кожным павеце ёсць прадстаўнікі арганізацыі, якія праводзяць антыдзяржаўную агітацыю, іх дзейнасць кантралюецца праз савецкіх дыпламатычных служачых. Цікава, што старшынёй таварыства названы сенатар В. Багдановіч, сябрамі – Якубоўская, Самахвалаў, У. Самойла, названы як “Самуілаў Уладзімір сын Яна як прадстаўнік партыі расійскіх кадэтаў-манархістаў у Парыжы” і іншыя [6, арк. 264]. Відавочна, гутарка ідзе пра арганізацыйныя намаганні праваслаўных беларускіх палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, якія ў 1927 г. прывялі да стварэння Праваслаўнага Беларускага Дэмакратычнага Аб’яднання.

Палітычная абумоўленасць паводзін і апазіцыйныя настроі праваслаўных актывістаў і святароў узмацнілася ў сувязі з працай польскай улады па стварэнні Польскай аўтакефальнай царквы. Адным з завадатараў супраціву аўтакефаліі стаў гродзенскі праваслаўны епіскап Уладзімір (В. Ціханіцкі). Верагодна, гэта стала вынікам яго канспіратыўных сувязей з беларускімі дзеячамі, аб’яднанымі вакол кіраўніцтва БНР на чале з В. Ластоўскім [7, с. 9–13]. Вядома, што беларуска-літоўскае супрацоўніцтва на антыпольскай глебе ажыццяўлялася па лініі стварэння падпольных і паўстанцкіх груповак у Заходняй Беларусі. На падставе існуючых архіўных дакументаў і з улікам Расійска-Літоўскай дамовы 12 ліпеня 1920 г. [8]. можна выказаць думку, што сумесная антыпольская ваенна-

палітычная беларуска-літоўская дзейнасць адбывалася з удзелам і пад кантролем савецкіх спецслужбаў і на карысць Савецкай Расіі – СССР. Пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца, у прыватнасці, звесткі пра тое, што некаторыя кіраўнікі заходнебеларускай партызанкі мелі арганізацыйна-канспіратыўныя сувязі з савецкімі спецслужбамі, у прыватнасці, славуты Г. Шыманюк, які ў арганізацыі паўстанцкай справы супрацоўнічаў і з літоўска-бэзнэраўскімі дзеячамі, і савецкімі агентамі, якія працавалі ў савецкім паўправстаўніцтве ў Коўна і заходнебеларускім падполлі [9, арк. 36а–37; 10, арк. 106–107].

Што да епіскапа Уладзіміра, то ў ходзе арыштаў удзельнікаў "заходнебеларускай партызанкі" вясной 1922 г. ён трапіў пад падазрэнне паліцыі. У час вобшуку ў яго знайшлі ліст Маскоўскага патрыярха Ціхана ад 14 студзеня 1922 г. В. Ластоўскаму, у якім Ціхан даў благаслаўленне ураду БНР. Польская паліцыя выказала меркаванне, што менавіта пры падтрымцы епіскапа Уладзіміра ўрад В. Ластоўскага схіліў Маскоўскага патрыярха Ціхана да паслання ліста-благаслаўлення, які "стаў пераломным у адносінах вышэйшага праваслаўнага духавенства да беларускага незалежнага руха". У паліцэйскіх дакументах епіскап Уладзімір пададзены як актыўны прадстаўнік праваслаўных антыпольскіх сіл, які меў сувязь з Г. Шыманюком, "добра падтрымліваў беларускую акцыю, ...акружыў сябе адабранымі людзьмі – пераважна беларусамі, ворагамі ўсяго, што польскае. Выдаляў святароў нявыгадных сабе. Мяняў, хаця без кваліфікацыі, пераважна на былых афіцэраў і былых жандараў, і гэтыя так званыя "душпастыры" у любую хвіліну маглі стаць кіраўнікамі паўстанчых аддзелаў, таксама маглі часова выконваць ролю інструктараў" [11; 12, арк. 32, 43, 44].

Вышэй прыведзеныя прыклады яскрава ілюструюць значэнне этнаканфесійнай праблематыкі ў грамадска-палітычных працэсах Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. Такога кшталту падзеі не былі адзінкавыя і сталі яскравай адметнасцю як канфесійнага жыцця, так і пацвярджэннем наяўнасці палітычных намаганняў беларускіх суполак і іх правадыроў па арганізацыі супраціву польска-каталіцкаму ўплыву ў адстойванні сваіх рэлігійных пачуццяў і палітычных прыярыэтаў. Аднак у тагачасных умовах іх адлюстраванне на старонках адкрытых выданняў БССР было непажадана з-за небяспекі выклікаць падазрэнне польскіх уладаў у антыдзяржаўнай дзейнасці ўдзельнікаў руху па абароне праваслаўя і яго нацыянальна арыентаваных беларускіх прыхільнікаў. Інфармацыя аб палітычнай антыпольскай актыўнасці праваслаўных вернікаў і святароў пагражала непрыемнай перспектывай далейшага пагаршэння стану праваслаўя і магчымых рэпрэсіўных дзеянняў з іх боку. Гэта зніжала магчымасць як адстойвання інтарэсу праваслаўнага насельніцтва і святароў, так і выкарыстання іх палітыка-рэлігійнай актыўнасці савецкімі інстанцыямі для арганізацыі антыпольскай барацьбы. Таму выданні БССР дэманстравалі асцярожнасць і вытрымку і не "рэкламавалі" адпаведныя факты і падзеі праваслаўнага жыцця, інфармацыя пра якія стала даступнай даследчыкам і чытачам у постсавецкі час, дзякуючы вяртанню забароненых раней публікацый і адкрыццю архіваў, што спрыяе прадметнаму даследаванню актуальнай тэмы ўдзелу беларускіх праваслаўных святароў у нацыянальна-вызваленчым руху Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Гэта тычыцца і іншых напрамкаў канфесійнай гісторыі, якія ў савецкі час не атрымалі належнай навуковай увагі і сёння чакаюць сваіх даследчыкаў [13, с. 180–181].

## Спіс крыніц і літаратуры


1. M. Krywičonak. Hołas Kryudy / M. Krywičonak // Kryniсa. – 1921. – 9 krasawika (№ 11). – S. 1–2.

2. М.С. Сучасная Польшча і Заходняя Беларусь / М.С. // Заходняя Беларусь. – Менск : ДБВ, 1925. – С. 3–30.

3. Лучанін, М. Заходняя Беларусь пад панаваньнем Польшчы / М. Лучанін. – Менск : Беларус. дзярж. выд., 1926. – 56 с.

4. Кон, Ф. Западная Белоруссия – колония панской Польши (к процессу над Белорусской Громадой) / Ф. Кон. – М. : Издательство ЦК МОПР СССР, 1928. – 38 с.

5. Заходняя Беларусь. – Менск : ДБВ, 1925. – 68 с.

6. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф. 2028. Воп. 1. Спр. 71.

7. Śleszyński, W. Walka instytucji państwowych z białoruską działalnością dywersyjną 1920–1925. Dokumenty do dziejów kresów północno-wschodnich II Rzeczypospolitej / W. Śleszynski. – Białystok: Polskie Towarzystwo Historyczne. Oddział: Wydawnictwo Prymat, 2005. – 182 s.

8. Міхнюк, У. Расійска-літоўскі дагавор 12 ліпеня 1920 г.: гістарыяграфія праблемы / У. Міхнюк // Беларус. гіст. часоп. – 2003. – № 8. – С. 3–11.

9. ДАБр. – Ф. 500. Воп. 1. Спр. 216.

10. Российский государственный архив социально-политической истории. – Ф. 495. Оп.123. Д. 249.

11. Сыч, Р. А. “Паліцыя Польшчы ў барацьбе з беларускім праваслаўным рухам у Заходняй Беларусі ў першай палове 1920-х гг.”. / Р. А. Сыч // III навукова-практычная канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі “ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы”, Мінск, 21 мая 2020 г. – Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Мінск, 2020. – С. 109–110.

12. ДАБр. – Ф.67. Воп.1. Спр. 22.

13. Савіч, А. А. Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2019. – 300 с.